

Справядлівасць, роўнасць, міласэрнасць!

Беларускі Усход

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!

МІЖРАЁННАЯ НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА

● Заснавана ў 1991 годзе ● № 4 (39) ● СУБОТА ● 30 студзеня 1993 г. ●

ДЛЯ ВАС, ЧЫТАЧЫ

● На 3-й старонцы газеты змешчана праграма тэлебачання на тыдзень.

● У наступным нумары публікуецца артыкул В.Вячоркі «Падумайма пра ўсходнюю палітыку», іншыя праблемныя матэрыялы.

ЗАЯВА

праўлення Магілёўскай гарадской арганізацыі НФ «Адраджэньне»

Развал таталітарнай імперыі, што дзесяцігоддзямі чыніла здзекі над людзьмі, стварыў умовы да ўзнікнення самастойнай і незалежнай Беларускай дзяржавы. А ў спадчыну ёй засталіся цяжкія праблемы, вырашыць якія трэба беларускаму народу.

Трэба падкрэсліць, што сам ход гісторыі парушыў планы былых сталінскіх паплечнікаў і іх духоўных паслядоўнікаў, што трымалі ўладу ў былым СССР да самага апошняга часу. Зразумела, што было дарэмна чакаць ад іх вырашэння праблем ахвяр сталінскага генацыду. Праз 5-10 гадоў нікога з іх не засталося б у жывых і праблема адпала б сама па сабе.

Лічаныя адзінкі з мільёнаў былых вязняў сталінскіх засценкаў дажылі да сённяшняга часу, калі нарэшце ўзнікла магчымасць хоць часткова вярнуць неаплатны доўг дзяржавы гэтым людзям.

Адна з найбольш вострых праблем — сёняшняе становішча нямногіх былых вязняў камуністычнага рэжыму, што яшчэ засталіся ў жывых. Рэабілітаваўшы іх нарэшце палітычна і маральна, вярнуўшы ім пасля доўгай цяганіны правы і чалавечую годнасць, дзяржава па сутнасці кінула іх на волю лёсу, нічога не зрабіла для іх сацыяльнай рэабілітацыі, бо ва ўмовах эканамічнага крызісу і інфляцыі, што пануюць на Беларусі, нельга сур'ёзна ўспрымаць як матэрыяльную дапамогу тыя нязначныя грашовыя сумы, што налічваюцца ў якасці матэрыяльнай кампенсацыі за панесены ўрон незаконна рэпрэсіраваным людзям.

Хаця сёння гаротнікі сталінскіх часін маглі б смела і абсалютна справядліва прад'яўляць судовыя іскі дзяржаве, бо згубленае здароўе, сапсаванае, разбуранае жыццё — зусім натуральныя аргументы.

Іх бядотнае становішча ўзмацняецца яшчэ і тым, што гэта — глыбока хворыя людзі, у іх парушаны сацыяльныя сувязі.

Мы лічым, што адна з галоўных прыкмет сапраўднай улады — яе гатоўнасць несці адказнасць за ўсе абяцанні і ўчынкі былых улад, незалежна ад іх ідэалагічных і палітычных арыентацый, тым больш, што яна назвалася правапрыемніцай мінулай улады, гэта значыць узяла на сябе не толькі ўсе яе здабыткі, але і даўгі. Толькі такім шляхам можна дабіцца даверу і павагі з боку грамадзян, забяспечыць трывалую аснову сваёй дзейнасці. Узнаўленне справядлівасці ў адносінах былых ахвяр дзяржавы, істотная падтрымка іх у гэты цяжкі час — адзін з найпершых крокаў на гэтым шляху.

Паўсядзенны клопат, дапамога і ўвага з боку мясцовай улады, навакольных людзей, дабрачынных арганізацый і установ — усё гэта павінна забяспечыць дзяржава, каб дні жыцця, што засталіся на гэтай зямлі рэабілітаваным, яны пражылі ў нармальных умовах існавання.

Са свайго боку, Магілёўская гарадская арганізацыя НФ «Адраджэньне» бярэцца прыняць самы шырокі ўдзел у справе каардынацыі дапамогі, яе падтрымкі і павышэння эфектыўнасці.

Рашуча патрабуем ад народных дэпутатаў, прадстаўнікоў выканаўчай улады неадкладна усебакова разгледзець становішча былых ахвяр незаконных рэпрэсій і аказаць ім усю неабходную дапамогу, падтрымаць не на паперы, а рэальна высакародную дзейнасць Магілёўскага таварыства ахвяр сталінскіх рэпрэсій.

Памяць загінуўшых і грамадзянскі абавязак клікаюць усіх нас да таго!

11.01.1993 г. **г. Магілёў.**

Жыццё, як яно ёсць



На здымку Дзмітрыя Пячкоўскага — адзін з яго землякоў з вёскі Крывая Ніва Касцюковіцкага раёна Мікалай Паўлавіч Бяляцкі. Пачуццё адзіноты адчувае ветэран вайны і працы на сваёй зямлі. Як жа так! Выгналі фашыстаў з яго вёскі, а «мірны» атам выгнаць немагчыма! (Спецыяльна для «Беларускага Усходу»).

ЗАЯВА

Сойму БНФ пра інфармацыйную палітыку

Беларускі Народны фронт заўсёды разглядаў свабоду слова як найвышэйшы прынцып дэмакратычнага грамадства, дзе кожны мае права на незалежнасць думак, пераканнняў. Але і пасля абвяшчэньня незалежнасці Беларусі ў інфармацыйнай палітыцы Вярхоўнага Савету і Ўраду пануюць і нават мацнеюць таталітарныя традыцыі.

Напачатку 1992 г. газеты і часопісы перад пагрозаю фінансавага краху адна за адной перайшлі пад заснавальніцтва Савету Міністраў. Прыкрываючыся заявамі аб «выратаваньні прэсы», Саўмін з маўклівае згоды Міністэрства інфармацыі перадаў найбуйнейшае выдавецтва «Беларускі Дом друку» свайму гаспадарчаму ўпраўленню. Журналістам далі зразумець, што іх месца — сярод абслугі наменклатуры.

Ціск на перыядычныя выданні, на тэле- і радыёрэдакцыі павялічыўся ў час падрыхтоўкі да рэферэндуму. Досыць прыгадаць ганеньні на праграму «Ніка». Міністэрства інфармацыі адмовілася забяспечыць законнае права дэпутацкай апазіцыі мець пастаянны эфірны час на радыё і телебачанні.

Нарэшце, на пачатку гэтага году без папярэджання, экспертызы і судовай працэдуры Улады спынілі трансляцыю незалежных тэлекампаніяў, чым яшчэ раз прадэманстравалі пасьлядоўнае імкненне ўстанавіць татальны кантроль над усімі каналамі інфармацыі.

Урад ня мае канцэпцыі інфармацыйнае палітыкі, якая б выходзіла з інтарэсаў Беларусі. Толькі ў 1992 г. Беларусь унесла паўмільярда рублёў на ўтрыманне тэлекампаніі «Астанкіна», якая так і ня стала крыніцай аб'ектыўнай інфармацыі пра падзеі на Беларусі і ў іншых, акрамя Расеі, дзяржавах СНД. Паўстае ўражаньне, што месца на гэтым канале знаходзіцца толькі для рэгіёнаў, дзе льецца кроў.

На ўсё вышэйсказанае Беларускі Народны фронт і дэпутаты апазіцыі шматразова зьвярталі ўвагу ў заявах і выступах. Мы зноў канстатуем супярэчнасць дзеянняў Ураду і Міністэрства інфармацыі прынцыпам свабоды слова ды інтарэсам беларускае дзяржавы.

Беларускі Народны фронт лічыць, што першачарговым крокам інфармацыйнай палітыкі Беларусі павінна стаць прыняцце Закону аб свабодзе друку, які б гарантаваў журналістам і ўсім грамадзянам бесперашкодны доступ да інфармацыі і поўную магчымасць выказаць погляды й пераканаьні. Гэты Закон стаў бы заслонай на шляху антыдзяржаўнай антыканстытуцыйнай дзейнасьці.

БНФ выступае за дэманапалізацыю сродкаў масавай інфармацыі. Праект адпаведнае пастановы яшчэ ў кастрычніку летась падаваўся на разгляд Вярхоўнага Савету Апазіцыяй БНФ і прадугледжваў немэтазгоднасць заснавальніцтва Саветам Міністраў больш як аднаго перыядычнага выданьня (інфармацыйнага бюлетэню).

Інфармацыйная палітыка павінна садзейнічаць узнікненьню і разьвіцьцю незалежных тэле- і радыёкампаніяў, перыядычных выданьняў, інфармацыйных агенцтваў, паколькі яны пашыраюць свабодную інфармацыйную прастору, ствараюць альтэрнатыву дзяржаўным СМІ і таму спрыяюць павышэньню агульнага ўзроўню аператыўнасьці, якасьці, дзейнасьці прэсы. Неабходна выправіць ненармальнае становішча, калі грамадзянам Беларусі фактычна навязваецца маскоўская трактоўка падзеяў у сьвеце, і далучыць Беларусь да сусьветнае інфармацыйнае прасторы. Відавочная неабходнасць паляпшэньня матэрыяльна-тэхнічнае базы нацыянальнага тэлебачання й радыё, павышэньня прафесіяналізму беларускіх журналістаў, радыкальных кадравых зьменаў у кіраўніцтве дзяржаўных СМІ.

БНФ «Адраджэньне» выступае за няўхільнае выкананне дзяржаўнымі й прыватнымі сродкамі інфармацыі Закону аб мовах. Эфектыўным спосабам ажыццяўлення прыярытэту дзяржаўнае мовы стала б скасаваньне на бліжайшыя гады ўсіх падаткаў для цалкам беларускамоўных сродкаў масавай інфармацыі.

Мы выступаем за кантроль грамадства над зьместам як дзяржаўных, так і прыватных тэлерадыёпраграмаў і выданьняў, які б бараніў дзяцей і падлеткаў ад праяваў маральнай разбэшчанасьці. Гэты кантроль павінен ажыцьцяўляцца на цьвёрда вызначатых Законам падставах.

Мы добра разумеем, што радыкальная зьмена да лепшага ў інфармацыйнай палітыцы немагчымая пры захаваньні ўлады намэнклатуры. Таталітарны кантроль над прэсай павінен саступіць месца панаваньню цывілізаваных дэмакратычных прынцыпаў свабоды слова і інфармацыі. Змаганьне за гэтыя прынцыпы — надзённая задача дэмакратычных сілаў краіны.

9 студзеня 1993 г.

НА ЗЛАДЗЕЯЎ І БОГА НЯМА

Усяго свайго пагалоўя птушкі пазбавілася ў студзені на ўласным падворку за адну ноч жыхарка вёскі Барсукі Дамамерыцкага сельскага Савета. А гэта ні многа, ні мала, а чатырох гусей і сямі курачак, якіх бабуля даглядала поўнае лета як дзіцятак. Зладзеі ў куратніку пакінулі ёй толькі скручаныя галовы.

А крыху раней двух гусей «увялі» ўжо ў самім райцэнтры, у маладой гаспадыні-навасёла па вуліцы Каралёва. Відаць, і ў першым выпадку, і ў другім, вырашылі паласавацца дармавой гусяцінкай. У той час, калі яна свабодна прадавалася перад калядамі ў цэнтральным харчовым магазіне раённага цэнтра.

А кажуць яшчэ, што на каляды трэба есці толькі скаромнае. Калі гэта было! Зараз на зладзеяў і Бога няма. Крадуць і на Нараджэнне Хрыстова, і на стары Новы год.

Іван ЛАПО.

супрацоўнік клімавіцкай раённай газеты «Родная ніва».

ВЫПУСКАЮТ ЗДЕСЬ ОБНОЗКИ: САПОЖКИ, ТАПОЧКИ, КРОССОВКИ...

Кричевский завод резиновых изделий — крупнейшее предприятие в городе над Сожем. И хоть, тотальный кризис задел своим черным крылом многочисленный коллектив завода — здесь все-таки умудряются выдюжить. Если сегодня почти сплошь и рядом идет сокращение не только административно-управленческого аппарата, но и рабочих, то здесь наоборот — создаются новые рабочие места. Против июля 1992 года здесь прибавилось число работающих на 292 человека.

Всего на начало этого года списочный состав рабочих и служащих завода достиг 1928 человек.

Только за декабрь прошлого года завод изготовил товаров народного потребления на 114 миллионов 559 тысяч рублей (в действовавших ценах).

Первое знакомство

С директором завода встречаемся на лестнице, ведущей на второй этаж.

— Вы из газеты? — спрашивает он. — А я Вас ждал-ждал, уже вот обеденного перерыва половину прошло. Решил пойти в столовую.

— Вы Вячеслав Николаевич?

— Так точно, — отвечает директор.

Так вот и познакомились на лестнице.

— Что ж, обед на завтра откладывать грешно, — говорю,шутя.

— К тому же обед, по наказу мудрых, раздели с товарищем, — в тон поддерживает разговор Шипицин. — Вы с дороги и, вероятно, проголодались. Так что завернем в нашу заводскую столовую.

В просторном обеденном зале, по-домашнему уютно, аппетитно обедают труженики предприятия.

— Посмотрим, чем нас сегодня кормят, — улыбнулся директор, приглашая меня за стол и сам усаживаясь.

Обед из трех блюд оказался довольно сытным и вполне доступным по цене.

— Чтобы обеды не «кусались», часть расходов на общепит завод берет на себя, — подсказывает директор, видя мою реакцию. — А еще выдаем каждому рабочему бесплатно спецпитание в связи с вредностью производства — бытылку молока в смену.

— Кроме столовой на заводе имеются два буфета, — дополняет директор.

За обедом, слово за слово, не теряя времени, знакомлюсь с Шипициным поближе.

Мой собеседник, оказывается сибиряк. Окончив среднюю школу и отслужив положенный срок в армии поступил в Московский авиационно-технический институт. Трудовой путь начинал на северном Кавказе инженером металлургического завода. С 1983 года — в Белоруссии. Начальник цеха производственного объединения Бобруйскшина. С апреля 1987 года возглавляет Кричевский завод резиновых изделий.

Лучше раз увидеть

О производстве, о делах за обедом не говорили. Вячеслав Николаевич так сказал:

— Лучше один раз увидеть, чем семь раз услышать. Пройдемся по цехам, покажу наше производство.

После обеда — «экскурсия». Директор вызвался быть гидом.

Проходя по заводскому двору обращаю внимание на строящийся новый большой четырехэтажный корпус.

— Это будет административно-бытовой комплекс, — поясняет «гид». Фундамент заложен в 1991 году. Возведение корпуса закончено недавно. В этом году планируем сдать в эксплуатацию и заселить. Здесь разместится административно-управленческий аппарат завода, медкомплекс, предприятия общественного питания, включая буфеты, кондитерский цех, два обеденных зала на 100 и 60 посадочных мест, бытовые помещения, душевые, раздевалка на 1320 человек, комнаты психологической разгрузки, женской гигиены и другие подсобные помещения.

В цехах

Хоть и вентиляция работает отлично, сразу чувствую специфические запахи горячей резины, клея, бензина, растворителей.

— Это свежему человеку чувствуется. А мы уже привыкли и просто не замечаем — адаптировались. И всё-таки, конечно, производство наше вредное, — признаёт директор, — потому и спецпитание выдается, и пенсия нашим рабочим и инженерно-техническим работникам назначается на льготных условиях, по списку № 2.

В цехе прессовки наблюдаем работу прессовщика-вулканизатора обуви Александра Петрачука.

— Наш лучший прессовщик, — говорит директор завода — прекрасный работник, активный общественник — большим авторитетом пользуется в нашем коллективе и в городе. Потому и народным депутатом горсовета его избрали.

В цехе спортивной обуви идеальный порядок. Много цветов.

— Это заслуга начальницы цеха Тамары Григорьевны Зиновой — поясняет Вячеслав Николаевич.

— Вы преувеличиваете. Я же не одна все это сделала, — скромничает симпатичная женщина.

— Но это же Ваша идея, Ваша инициатива, — настаивает директор. — Ведь помните, многие считали напрасной эту затею, говорили, что цветы здесь погибнут. А что получилось? Воздух стал чище и красота какая, уют!

О мастере цеха Марии Андреевне Спиридоновой говорят здесь с особенной теплотой. Сегодня это уже пожилая женщина, но еще с молодым задором. Она была первым секретарем комсомольской организации завода еще в 1949 году. Росла и мужала вместе с заводом. Начинала рядовой рабочей. 10 лет «пахала» на разных участках, где было потрудней. Только благодаря смекалке, пытливости, природному уму без специального образования выросла от рабочей до мастера цеха.

В заготовительном отделении цеха — большая груда обрезков утеплительных материалов для резиновой обуви.

— Раньше это шло в отходы производства, — говорит Галина Ивановна Чубкова, бригадир пошивочного конвейера. — Теперь эти отходы дают приличные доходы. Из них налажен выпуск домашних комнатных тапочек без задников.

Контролёр ОТК Валентина Адольфовна Букинич придирчиво осматривает каждую пару готовых тапочек, определяет их качество. Брак она никогда не пропустит.

Ловко и быстро в этой смене осуществляла обработку и упаковку тапочек к реализации сортировщица Вера Владимировна Улазовская.

Особенно многолюдно на конвейере, можно сказать, клейщиц. Ибо здесь работают в основном женщины.

Здесь даже состоялось блиц-собрание. Минут на пять остановился конвейер. Женщины-клейщицы окружили директора и засыпали его массой наболевших вопросов.

Улучив момент, интересуюсь у стоявших поодаль женщин, сколько они зарабатывают:

— По четвертому разряду — тысяч восемь, от силы 10 в месяц...

— Устраивает такая зарплата?

— Мало, конечно, сетуют женщины, — разве это деньги по нынешним ценам? Только на питание. А детей-школьников одеть-обуть?

Хотелось сказать: — «А как же колхозники за 2-3 тысячи месяц вкалывают? Как им-то своих деток одеть-обуть?» — да промолчал.

Тем временем ответы директора, видать, удовлетворили окружавших его женщин, те с улыбкой стали у конвейера, вновь пошла работа...

Забота о людях

В первую очередь, конечно, администрация старается сделать все возможное и даже сверх того, чтобы рабочие завода зарабатывали не меньше, чем на других предприятиях. Средняя зарплата за декабрь 1992 года здесь составила 7846 руб. При этом минимальная — 5532 рубля, максимальная — 15045. Как видим, минимальная превышала более чем вдвое установленный законом минимум. И нет большого разрыва межу минимумом и максимумом.

Завод участвует в долевом строительстве 15-ти двух-трехкомнатных квартир. Отведены земельные участки под строительство 50 коттеджей усадебного типа, с расчетом на последующую приватизацию. Закладывается строительство 58-квартирного дома за средства рабочих с рассрочкой платежа на 30 лет и льготой: при трудовом стаже на заводе 30 лет скидка со стоимости жилья 70 процентов.

И все же до решения жилищной проблемы не так близко, как хотелось бы. На очереди — 320 семей.

Завод имеет 3 детсада на 475 мест. Причем пока заполняемость его не превышает 50 процентов.

Есть на заводе свой фирменный магазин по продаже резиновой обуви.

— Вячеслав Николаевич, на заводе еще задолго до «перестройки», когда и говорить-то многие об этом боялись, тут была забастовка. А в Вашу бытность директором, тем более что Вы пришли сюда уже в «демократическое» время, рабочие не бастовали?

— Было такое. Бастовали.

Правда не весь коллектив бастовал. Завод не останавливался полностью. Конфликтовала лишь часть рабочих. Однако это лихорадило коллектив. Но то уже в прошлом. Сейчас изменился взгляд рабочих на администрацию. Если раньше вырисовывалась линия контраста, то теперь господствует единомыслие, согласие, взаимопонимание.

Продукция завода

В трех производственных корпусах завода с конвейеров сходят различные виды обуви. Здесь делают обычные рабочие спецовки — сапоги, блестящие лакированные сапожки, ботинки, кроссовки. Обувь черная и цветная, простая и изящная. Обувь детская и для взрослых. Большие партии обуви уходят в разные страны ближнего и дальнего «замежжа». Вот и в этот день, когда мы вели заключительную беседу в директорском кабинете, нам то и дело «мешали» звонки из Ростова, Днепропетровска, Смоленска, Москвы и даже из Сибири. Просили поставить утепленную резиновую обувь разного ассортимента и большими партиями.


За прошедший год на заводе изготовлено 4 миллиона 190 тысяч пар различной резино-текстильной и полихлорвиниловой обуви с меховым утеплительным чулком.

Выпускаются и некоторые резино-технические изделия. В основном для автомобилестроения.

ВСЕ ДЛЯ ВАС, ПОКУПАТЕЛИ!



В фирменном магазине завода



Эта обувь — для хорошего настроения, широкий выбор расцветок и моделей, отличная обувь! Покупайте и носите на здоровье!

Тэкст В.ДАУГАЛЕВА. Фото В.БЫСОВА.

ТЕЛЕВИДЕНИЕ

ПОНЕДЕЛЬНИК, 1 февраля

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

18.30 Новости Би-Би-Си.
19.00 Областные новости (Брест).
ПОКАЗЫВАЕТ МОГИЛЕВ
19.10 День области.
19.20 Горячая тема: «Где взять лекарства?».
19.45 А.Смольский. Симфония № 3.
20.10 ТО «Мэта». «Единство чувств».
20.35 Реклама.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 Спортивный телекурьер.
21.50 Реклама.
21.55 «Профиль и анфас». Худ. фильм.
23.10 НИКа.
23.25-0.55 ТО «Мэта». Телевизионный Дом кино.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00; 8.00; 11.00; 14.00; 17.00; 20.00. Новости.
5.30 «Утро».
7.45 Фирма гарантирует.
8.20 «Посмотри, послушай».
8.40 Премьера телефильма «Спираль». 1-я серия.
10.00 «Марафон-15».
10.50 Мультфильм «Туман из Лондона».
14.20 Программа передач.
14.25 Телемикст.
15.10 Блокнот.
15.15 «Эмиль из Леннеберги». 5-я серия.
15.40 Для детей. «Пес и кот».
16.10 Звездный час.
16.50 Технодром.
17.20 Программа передач.
17.25 Мультфильм.
17.30 «Гол».
17.45 НЭП.
18.15 Хоккей. В перерыве — Спокойной ночи, малыши.
20.35 Программа передач.
20.40 «Спираль». 1-я серия.
22.00 «Пресс-клуб». В перерыве (00.00) — Новости.
00.40 «Пресс-экспресс».
00.50 «Плыви, кораблик». Худ. фильм.

ВТОРНИК, 2 февраля

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

8.00 Утро республики.
8.10 Программа передач.
8.15 Фильм-концерт.
9.00 Музыка и пение. 5-й класс.
9.30 «В профиль и анфас». Худ. фильм
10.45 С музыкой на Вы.
11.30 Киноочерк.
11.45 «Мачеха». Худ. фильм.
13.30 Новости.
13.40 Киноочерк.
13.55 «На исходе ночи». Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.
16.10 История Беларуси. 8-й класс.
16.45 Программа передач
16.50 С.Ковалев. «Приключения деревянного рыцаря». Спектакль.
18.00 Док. фильм.
18.30 Новости Би-Би-Си.
19.00 Областные новости (Витебск).
19.10 Экономическая волна. Проблемы современного села. Прямая линия.
20.15 «Я помню вальса звук чудесный...». Поет Т. Печинская.
20.35 Реклама.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 «Мачеха». Худ. фильм.
22.20 На сессии ВС РБ.
По окончании — Телебиржа. Реклама. Видеосалон.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00; 8.00; 11.00; 14.00; 17.00; 20.00; 23.00. Новости.
5.30 «Утро».
7.45 Фирма гарантирует.
8.20 «Гол».
8.55 «Спираль». 2-я серия.
10.00 В мире животных.
10.50 Пресс-экспресс.
11.20 «Плыви, кораблик». Телефильм.
12.30 Мультфильм.
12.45 «Долгие версты войны». Телефильм. 1-я серия.
14.20 «Предприниматель».
14.25 Деловой вестник.
14.40 Мир денег Адама Смита.
15.10 Блокнот.
15.15 Мультфильм.
15.30 «Эмиль из Леннеберги» 6-я серия.
15.55 «Таланты и поклонники».
17.20 Программа передач.
17.25 «Поклонюсь огню».
17.50 И.С.Бах. Концерт ля мажор.
18.05 «Возвращение в Эдем».
18.55 «Тема».
19.40 Спокойной ночи, малыши.
20.35 Программа передач.
20.40 «Спираль». 2-я серия.
22.10 «Песня-93».
23.40 «Кино, до востребования».
00.20 Пресс-экспресс.
00.30 «Собака Баскервилей». Телефильм. 1-я серия.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00; 13.00; 19.00; 22.00. Вести. 7.20; 13.20; 19.20. Реклама.
15.00 Телебиржа.
15.30 Там-там новости.
15.45 «Старая мельница».
16.15 «Сотвори добро».
17.00 Сказки для взрослых.
17.30 Хранители истины.
18.00 Парламентский вестник.
18.15 «Последние письма». Док. фильм.
18.45 Праздник каждый день.
19.25 «Санта-Барбара».
20.15 «А.П.Чехов времен приватизации». Передача 2-я.
21.00 Альбуцид.
21.30 «Прощание славянки».
22.20 Звезды говорят.
22.25 Спортивная карусель.
22.35 Антракт.
22.40 На сессии ВС России.
22.55 Опера Д.Верди «Дон Карлос».

СРЕДА, 3 февраля

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

8.00 Утро республики.
8.10 Программа передач.
8.15 Фильм-концерт.
9.00 История Беларуси. 8-й класс.
9.35 «Мачеха». Худ. фильм.
10.25 Фильм-концерт.
11.05 «Сумасшедшие на стадионе». Худ. фильм.
13.30 Новости.
13.40 «Летучая мышь». Худ. телефильм. 1-я и 2-я серии.
16.55 Программа передач.
17.00 Мультфильмы.
ПОКАЗЫВАЕТ МОГИЛЕВ
18.00 День области.
18.10 Программа «Чернобыль-93».
18.30 Новости Би-Би-Си.
19.00 Областные новости (Гомель).
19.10 «Пять звезд». Телеигра.
19.55 Здоровье. Тележурнал.
20.25 Реклама.
20.30 ТО «Эхо».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 Реклама.
21.35 «Мачеха». Худ. фильм.
22.25 На сессии ВС РБ.
По окончании — Баскетбол.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00; 8.00; 11.00; 14.00; 17.00; 20.00; 23.00. Новости.
5.30 Утро.
7.45 Фирма гарантирует.
8.20 Программа передач.
8.25 Концерт мужского хора МИФИ.
8.55 «Спираль». 3-я серия.
10.15 «Пес и кот».
10.45 «Пресс-экспресс».
11.20 «Копилка». Телефильм. 1-я серия.
12.30 Мультфильмы.
12.50 «Долгие версты войны». 2-я серия.
14.20 Программа передач.
14.25 «Телемикст».
15.10 Блокнот.
15.15 Мультфильм.
15.30 «Эмиль из Леннеберги». 7-я серия.
15.55 «Между нами, девочками...»
16.15 Мультфильм «Летающий дом».
16.45 Технодром.
17.20 Программа передач.
17.25 Останкино представляет: «Беседа» (Беларусь).
17.50 Мультфильм.
18.00 «Возвращение в Эдем».
18.50 Миниатюра.
19.00 «Черта с два».
19.40 Спокойной ночи, малыши.
19.55 Реклама.
20.35 Программа передач.
20.40 «Спираль». 3-я серия.
22.00 «Иосиф Кобзон в кругу друзей, коллег и зрителей».
23.50 «Абрамцево, Савва Мамонтов». Телефильм.
00.40 «Пресс-экспресс».
00.50 «Собака Баскервилей». 2-я серия.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00; 13.00; 19.00; 22.00. Вести. 7.20; 13.20; 19.20. Реклама.
7.25 Время деловых людей.
7.55 Альбуцид.
8.25 «Прощание славянки».
8.50 Неопалимая купина.
9.20 Устами младенца.
9.50 «Сказки для взрослых».
10.20 Хранители истины.
10.50 Мульти-пульти. Карпуша.
11.00 «Закат». Худ. фильм.
12.25 Досуг. «Под знаком Рыбы».
12.40 Крестьянский вопрос.
13.25 «Пани Мария». Худ. фильм.
15.00 Сигнал.
15.15 Там-там новости.
15.30 «15-летний капитан».
16.00 «Дальний Восток».
16.45 Христианская программа.
17.15 «Как Иванушка-дурачок со змеей боролся».
18.15 Российский бизнесмен-92.
18.45 Праздник каждый день.
19.25 «Санта-Барбара».
20.15 Сам себе режиссер.
20.45 Антракт.
21.00 Студия «Нота бене».
22.20 Звезды говорят.
22.25 Спортивная карусель.
22.30 Экран криминальных сообщений.
22.40 На сессии ВС России.
23.10 Кино Сергея Дебижева.

ЧЕТВЕРГ, 4 февраля

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

8.00 Утро республики.
8.10 Программа передач.
8.15 Док. фильм.
9.00 «Ромео и Юлия». Фильм-балет.
9.15 «Мачеха». Худ. фильм.
10.05 Фильм-концерт.
10.45 «Пять звезд». Телеигра.
11.30 Чемпионат по баскетболу. Мужчины.
12.50 «Романсы». Фильм-концерт.
13.10 «Семь сторон квадрата».
13.30 Новости.
13.40 Док. фильм.
14.05 «Еще до войны». Худ. телефильм.
16.15 Белорусская литература. 10-й класс.
16.55 Программа передач.
17.00 «Встреча с синей птицей».
17.30 Мультфильм.
18.00 Док. фильм.
18.30 Новости Би-Би-Си.
19.00 Областные новости (Гродно).
19.10 Зачитайте мое письмо...
19.15 Три кита.
19.55 Родное слово. Тележурнал.
20.25 Неделя белорусского правительства.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 Реклама.
21.35 «Мачеха». Худ. фильм.
22.25 На сессии ВС РБ. После окончания: Худ. фильм «Коррупция». Информационно-музыкальная программа.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00; 8.00; 11.00; 14.00; 17.00; 20.00; 23.00. Новости.
8.20 «Кидди-видди».
8.35 «Спираль». 4-я серия.
10.10 «...До шестнадцати и старше».
10.50 Пресс-экспресс.
11.20 «Копилка». Худ. телефильм. 2-я серия.
12.25 Короткометражный телефильм.
12.50 «Долгие версты войны». 3-я серия.
14.20 Программа передач.
14.25 Телемикст.
15.10 Блокнот.
15.15 Мультфильм.
15.35 «Эмиль из Леннеберги». 8-я серия.
16.00 «Как мы». Передача из Тулы.
16.25 «Единый мир».
17.20 «...До шестнадцати и старше».
18.00 «Возвращение в Эдем». Худ. фильм.
18.50 «Большая прогулка».
19.40 Спокойной ночи, малыши.
20.35 Программа передач.
20.40 Лотто «Миллион».
21.10 «Репортаж ни о чем».
21.25 «Спираль». 4-я серия.
23.20 Программа передач.
23.25 Фестиваль «Овация».
00.40 Пресс-экспресс.
00.50 «Копилка». Худ. телефильм. 1-я серия.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00; 13.00; 19.00; 22.00. Вести 7.20; 13.20; 18.55; 19.20; 21.55. Реклама.
7.25 Время деловых людей.
7.55 Студия «Нота бене».
8.50 Сам себе режиссер.
9.20 «Сидней большой и маленький».
9.50 Тишина № 9.
10.50 Мульти-пульти.
11.00 «Санта-Барбара».
12.40 Крестьянский вопрос.
13.25 Ностальгические посиделки.
13.55 Досуг.
14.10 С.Мрожек. «Чародейная ночь».
15.00 Алгоритм.
15.30 Там-там новости.
15.45 «Игра без проигрыша».
16.15 «Штрихи к портрету».
17.00 М-трест.
17.15 Оппозиция.
18.00 Парламентский вестник.
18.15 Кипрас Мажейка.
18.45 Праздник каждый день.
19.25 «Санта-Барбара».
20.15 В мире авто- и мотоспорта.
20.50 Мультфильм для взрослых.
21.00 Отечество мое. «Преображение».
22.20 Звёзды говорят.
22.25 Спортивная карусель.
22.30 Давайте разберемся.
22.40 На сессии ВС России.
23.10 Балет Петербурга. Юбилей А.Макарова.

ПЯТНИЦА, 5 февраля

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

8.00 Утро республики.
8.10 Программа передач.
8.15 Фильм-концерт.
9.00 Белорусская литература.
9.45 «Мачеха». Худ. фильм.
10.30 Три кита.
11.10 Худ. фильм «Сорок первый».
12.40 «Трансплантация души». Док. фильм.
13.30 Новости.
13.40 Фильм-концерт.
14.10 Киноочерк.
14.40 «Имя Розы». Худ. фильм.
16.55 Программа передач.
17.00 Юная пианистка Света Лагачева.
17.35 Мультфильмы.
18.00 Док. фильм.
18.20 Телевизионная доска объявлений.
18.30 Новости Би-Би-Си.
19.00 Областные новости (Могилев)
19.10 Говорим по-белорусски.
19.30 Путешествие по Америке.
19.55 «Пока горит свеча». Елена Блавацкая.
20.30 Реклама.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 Худ. фильм «Сорок первый».
23.00 На сессии ВС РБ. По окончании: Телебиржа, «1308» Хит-парад.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00; 8.00; 11.00; 14.00; 17.00; 20.00; 23.00. Новости.
5.30 «Утро».
7.45 Фирма гарантирует.
8.20 Фильм — детям «Собака и влюбленные».
9.35 Театр танца «Славяне».
9.50 Мультфильм.
10.00 Клуб путешественников.
10.50 Пресс-экспресс.
11.20 Америка с Таратутой.
11.50 «Маленький принц». Фильм-спектакль.
13.50 Мультфильм.
14.20 Программа передач.
14.25 Бридж.
14.50 Бизнес-класс.
15.05 Блокнот.
15.10 Фильм — детям. «Собака и влюбленные».
16.25 Мультфильм.
16.45 Дело.
17.20 Программа передач.
17.25 «Остров Крым».
17.45 Человек и закон.
18.15 Америка с Таратутой.
18.45 Поле чудес.
19.40 Спокойной ночи, малыши.
19.55 Реклама.
20.40 Человек недели.
20.55 Кинодетектив «Болотная лихорадка».
22.25 Политбюро.
23.20 Музобоз.
00.00 Авто-шоу.
00.15 Площадка обоза. В перерыве (00.00). — Новости.
01.15 Прес-экспресс.
01.25 «Копилка». 2-я серия.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00; 13.00; 19.00; 22.00. Вести. 7.20; 13.20; 18.55; 19.20. Реклама.
7.25 Время деловых людей.
7.55 Отечество мое.
8.50 «Внимание — снимаю».
9.05 Кипрас Мажейка.
9.35 Ретро. Песни 30-х. Часть 1-я.
10.05 Белая ворона.
10.50 Визитная карточка.
11.20 «Санта-Барбара».
12.10 Телекроссворд.
12.40 Крестьянский вопрос.
13.25 Ижица.
13.55 Фестиваль танца Америки.
15.00 Телебиржа.
15.30 Там-там новости.
15.45 «Наш Ералаш».
16.15 Трансросэфир.
16.40 Большой круг.
17.00 У.Дисней. «Звездный странник». 4-я серия.
17.55 «Русская песня». Вечер Петровой.
19.25 Праздник каждый день.
19.35 Худ. фильм «Ха-Би-Ассы».
21.00 «К-2» представляет: «Медиа».
22.20 Звезды говорят.
22.25 Спортивная карусель.
23.30 «Звучание моей планиды». Передача 4-я.
22.45 На сессии ВС России.
23.15 Вечерний салон.

СУББОТА, 6 февраля

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

8.00 Утро республики.
8.10 Программа передач.
8.15 Док. фильм.
8.50 «Очень страшная история». Худ. фильм.
10.00 Показывает Витебск.
11.00 Международное обозрение.
11.15 «Маппет-шоу». Мультфильм.
11.40 Картины художника Игнатова.
12.00 «Жили-были три сестры...»
12.40 20 минут редактора.
13.00 «Сувенир для прокурора». Худ. фильм.
14.30 Сокровища белорусской истории.
14.55 Мультфильмы.
15.25 Жизнь и творчество писателя В.Павлова.
16.00 Семь цветов радости.
16.30 Христианская программа.
17.00 «Композиторы Беларуси.
18.00 «Объектив-театр».
19.00 Соревнования по кикбоксингу.
20.00 Реклама.
20.05 Хоккей. Кубок МХЛ.
20.45 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 Реклама.
21.35 Худ. фильм «Бал».
23.20 НИКа.
23.35-0.35 Видимо-невидимо.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

6.00; 14.00; 20.00; 23.00. Новости.
6.30 Пресс-экспресс.
6.45 Субботнее утро делового человека.
7.30 Спорт-шанс.
8.00 Марафон-15 — малышам.
8.25 Эльдорадо.
8.55 Автограф по субботам.
9.20 Мультфильм.
9.30 Очевидное-невероятное.
10.00 Музыкальный киоск.
10.30 «Последний император».
11.30 Авиакосмический салон.
11.45 Телефильм «Заключенные».
14.20 Программа передач.
14.25 «Дракулито-вампиреныш».
14.45 Ультра-си.
15.45 В.А.Моцарт. Концерт ре мажор.
16.05 Красный квадрат.
16.45 «Счастливый случай».
17.45 Худ. фильм «Голубой гром» (США).
19.40 Спокойной ночи, малыши.
20.35 Программа передач.
20.40 «Аншлаг, аншлаг». Ян Арлазоров.
22.00 «Любовь с первого взгляда».
22.40 «Визитер». Мультфильм для взрослых.
23.15 «Комедия о Лисистрате».
00.50 Киноконцерт.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00; 13.00; 19.00; 22.00 Вести.
7.25 Свой взгляд на мир
7.50 Параллельные миры.
8.20 Студия «Рост». «Наш Ералаш».
8.50 Козырная дама.
9.20 «Дмитрий Ситковецкий, или Американцы в России». Фильм 2-й.
10.15 45 минут.
11.00 «Алые паруса».
12.30 Зигзаг удачи. Отборочный тур.
12.40 Крестьянский вопрос. «Сев».
13.20 Пилигрим.
14.05 Карьера. Конкурс секретарей-референтов.
15.05 «Дораэмон». 21-я серия.
15.20 «К-2» представляет: «Звезды Америки».
15.50 Футбол без границ.
16.45 Творческий портрет Никиты Джигурды.
17.45 Анонс телеканала «Россия».
18.00 Парламентский вестник.
18.15 Устами младенца.
18.55 Реклама.
19.25 Праздник каждый день.
19.35 «Шура и Просвирняк». Худ. фильм.
21.00 Контрасты.
21.40 Репортер.
21.55 Реклама.
22.20 Звезды говорят.
22.25 Спортивная карусель.
22.30 Ассорти.
23.00 Программа «А».
23.30 Концерт группы «Альянс».
00.00 «Господин оформитель». Худ. фильм.

ВОСКРЕСЕНЬЕ, 7 февраля

БЕЛОРУССКОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ

8.00 Утро республики.
8.10 Программа передач.
8.15 «Слово к человеку». Обращается проповедник христианской миссии Рик Рэнер.
8.45 Фильм-концерт.
9.15 Дела военные.
10.00 «Мачеха». Худ. телефильм.
11.40 Мультфильм.
12.15 «Богатыри». «Твои возможности, человек».
12.45 Сага о Беларуси.
13.35 Информационно-музыкальная программа.
14.05 «Восьмой цвет радуги». Концерт.
15.05 Орбита. Представляет телевидение Украины.
16.05 Киноэкран-93. Февраль.
17.10 Суть. Духовно-религиозная программа.
18.00 С понедельника... Кто в тереме живет!
18.35 Приглашаем на вечерки.
19.55 Реклама.
20.00 Панорама.
20.30 «Каскад».
20.40 Колыбельная.
21.00 Студия «Смысл» в Лепельском районе.
22.30 Реклама.
22.35 НИКа.
22.50 Королевская охота. Шоу-казино.
23.50-00.30 Студия «Тэлесябрына» МТУ в Беларуси. Сиз-бар-топ-20.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

6.00; 14.00; 17.45; 23.00. Новости.
6.25 Тираж «Спортлото».
6.40 «Час силы духа».
7.40 Центр.
8.10 Соло.
8.35 «С утра пораньше».
9.05 Пока все дома.
9.35 «Утренняя звезда».
10.25 Под знаком «пи».
11.15 Телефильм «Приключения Черного красавчика».
11.40 «Новое поколение выбирает...»
12.30 Мультфильм «Пиф и Геркулес».
12.40 «Подводная одиссея команды Кусто».
13.30 «Эрмитаж». Фильм 6-й.
14.20 «Диалог в прямом эфире».
15.00 Клуб путешественников.
15.50 Живое дерево ремесел.
15.55 Панорама.
16.35 «Телелоцця».
16.50 Мультфильмы.
18.00 «Один день Большого театра».
19.00 Премьера телефильма «Возвращение длинного Джона Сильвера на остров сокровищ». (Австралия).
20.45 Московский кино-хит-парад.
21.00 Итоги.
21.45 Спортивный уик-энд.
22.00 «Ныне».
23.20 Программа передач.
23.25 «Ночные страсти».

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00; 13.00; 19.00; 22.00. Вести.
7.25 Баскетбольное обозрение.
7.55 Программа «03».
8.25 Легкая атлетика. Турнир «Русская зима».
9.00 Телетеатр. «Волшебная палочка».
10.00 Аты-баты...
10.30 Пигмалион.
11.00 Час фортуны.
12.15 Телекроссворд. «Муз. биржа».
12.40 Шесть соток.
13.20 «Не вырубить»...
13.40 Лучшие игры НБА.
14.40 «Где София — тут и Новгород».
15.20 Познер и Донахью.
15.50 В мире животных.
16.50 У.Дисней. «Новые приключения Винни Пуха». «Черный плащ».
17.45 Музтелефильм «Рок-н-ролл: ранние годы».
18.45 Праздник каждый день.
19.00 Вести.
19.25 Мавриксеева и В.Тонков приглашают на юбилей.
20.25 Кино-меню.
20.40 Мультфильм для взрослых.
21.00 «Снег — судьба моя». Док. фильм.
22.20 Звезды говорят.
22.25 Спортивная карусель.
22.30 «Рецепт ее молодости». Худ. фильм.
24.00 Центр Стаса Намина. Клуб «Желтая подводная лодка».

Таленты нашага краю

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ СТАРОНКА

● **Агляд паэзіі**

ТАЛЕНТЫ НАШАГА КРАЮ —

з такой назвай нярэдка з'яўляецца літаратурна-мастацкая старонка ў газеце «Беларускі Усход», якая разлічана на чытачоў Хоцімскага, Касцюковіцкага, Клімавіцкага, Краснапольскага, Крычаўскага, Мсціслаўскага, Слаўгарадскага, Чэрыкаўскага і іншых раёнаў Усходняй Беларусі. Хто ж аўтары твораў, якія тут друкуюць?

На старонках «Беларускага Усходу» часта выступае са сваімі вершамі аўтар двух паэтычных зборнікаў **Сямён Пацёмкін**, які жыве ў Касцюковічах. Разнастайная тэматыка яго твораў. Сямён Пацёмкін найбольш вядомы як паэт-сатырык. Нярэдка можна сустрэць у гэтага аўтара і творы, якія выклікаюць сур'ёзны роздум над гісторыяй нашага народа.

Вось і ў вершы С.Пацёмкіна «Мужык» горкая праўда пра мінулае блізкіх нам людзей:

Я цяпер нічога не маю,
Шмат што ў памяці век мой сцёр.
Але ўсё-такі я ўспамінаю
Іншы раз пра сваё жыццё.

Рэвалюцыя нас разбудзіла,
Да вышынь перамог прывяла,
Сілу-моц у душы ўсяліла
І зямлю сялянам дала.

Пакрысе збудаваў я хату,
На багацці займеў разлік.
На палосцы працай заняты,
Усвядоміў, што я мужык.

На кірмаш я не крочыў пешы,
Ехаў з жонкай святочным днём.
Конь мой быў між суседскіх лепшы,
Ганарыўся сваім канём.

У мяне і гумно, і клеці —
Збудаванні, як на падбор.
Для кармоў і для дроў павеці,
Для жывёлы шырокі двор.

Ды на свеце позна ці рана
Уздагон крочыць іншы час.
Наплыло зусім нечакана
На вяскоўцаў слова — калгас.
А потым гэтага хлебароба
Аб'явілі кулаком.
Дом аддай! — мне сказалі
строга. —
Канцылярыя будзе тут.
І прынеслі вусатага «бога»,
Дзе Хрыстос быў, заняў ён кут.
(«Беларускі Усход» за 30 мая 1992 г.)

Самога мужыка ўсё ж прынялі ў калгас. Але ён застаўся «без гумна, без двара, без гавяды, без каня».

Гэты верш выклікае глыбокі роздум. Бо, працуючы ў рэдакцыі, мне часта даводзілася гутарыць з дзецьмі кулакоў. Нярэдка гэтыя кулакі, высланыя з родных мясцін, гінулі ад голаду і холаду ў далёкай Сібіры. Мала каму з іх удалося выжыць. Выходзіць, што калі ты руплівы гаспадар, а не лайдак і абібок, то канай за гэта. Быў круты час. Зараз многія з былых кулакоў рэабілітаваныя. Усё павінна стаць на сваё месца. У кожнага чалавека ёсць свая радзіма. І памнажаць яе багацце можна толькі сумленнай стваральнай працай.

Іван Пехцераў нарадзіўся на Клімаўшчыне. Цяпер жыве і працуе ў Магілёве. Мае некалькі зборнікаў паэзіі. Ён піша па рускай мове. Магчыма таму, што працяглы час працаваў у Расіі. Чытаючы вершы гэтага паэта, заўсёды радуешся за яго. Бо ў кожным з іх заўсёды знойдзеш «ізюмінку». Вось некалькі радкоў з яго верша «Любовь»:

Она измучила меня!
И мучить век не перестанет,
Тревогой ночи, светом дня
Мне до скончанья века станет.
Уйдет, обидев сгоряча,
И снова сердце отуманит
И, как девчонка, хохоча,
Меня счастливого поманит.
Она то вспыхнет, как сирень,
То, как черемуха, увянет,
То даст надежду мне на день,
А то на год возьмет обманет.
(«Беларускі Усход» за 19 верасня 1992 г.)

Нядаўна («Беларускі Усход» за 14 лістапада 1992 г.) была змешчана ў газеце нізка вершаў журналіста **Івана Лапо** з Клімавіч. Радуе тое, што з яго творамі мелі магчымасць пазнаёміцца нашы суседзі.

З цікавасцю і надзеяй, відаць, сочаць чытачы за творчымі спробамі **Ірыны Даўгалёвай**, якая дэбютавала са сваімі вершамі летась. Так, пад рубрыкай «Першая проба пяра» былі змешчаны яе творы «Апошняя любоў» на беларускай мове і «31 июля» — на рускай («Беларускі Усход» за 23 мая 1992 г.).

Ірына Даўгалёва скончыла Хоцімскую СШ № 1 з залатым медалём, Мінскі тэхнікум сувязі з чырвоным дыпломам. Зараз працуе загадчыцай агульнага аддзела рэдакцыі газеты «Беларускі Усход». Вершы пачала пісаць у школьныя гады. Піша яна на розныя тэмы: пра светлыя пачуцці чалавека, аб роднай прыродзе.

Даволі часта можна сустрэць на старонках газеты творы **Аркадзя Назаранкі**. Можна было пачытаць вершы **Мікалая Саўчанкі, Трыфана Лістападава** і іншых аўтараў.

Пажадаем і надалей рэдакцыі «Беларускага Усходу» падтрымліваць цесныя сувязі з мясцовымі паэтамі і пісьменнікамі.

М. МІНЧАНКА.

ЗІМОВЫЯ ЭЦЮДЫ

Гляджу ў вакно. З неба густа сыплюцца пушыстыя, як вата, сняжынкі, павольна і ціха кладуцца на зямлю. Белыя стрэхі дамоў. Белая дарога. Белыя галінкі дрэў. Бялютка ўсё навокал. Зусім зіма.

***

Яна стаяла на прыпынку. Белая шапачка. Белыя боты. І паружавелыя ад марозу шчокі.

Патрохі церушыў снег. Яна рукавічкамі лавіла халодныя сняжынкі і шчыра, гарэзліва ўсміхалася. Дальбог — снягурачка.

***

Дзве птушкі, адна з якіх была чырвонагрудай, прымасціліся на рабінавай галінцы і раз-по-раз, весела шчабечучы аб нечым паміж сабой, датыкаліся адна да адной сваімі дзюбкамі. Мілаваліся, як закаханыя. І ні па чым ім быў той снег, што зверху церушыў. І холад быў ні па чым — іх душы саграваў узаемаразуменне.

***

Сабака нечакана выскачыў на склізкую дарогу і трапіў пад колы аўтамабіля. І вось ляжыць ён раздаўлены. Вакол яго на белым снезе стварылася ярка-чырвоная пляма. Людзі, што стаялі на аўтобусным прыпынку, моўчкі глядзелі на загінуўшую істоту. Кожны думаў аб сваім. Толькі адзін з мужчын, невысокі, у цёплай ватоўцы, папраўляючы на галаве шапку, пашкадаваў:

— Эх, бедалага! Усяго тры дні да Новага года не дажыў. Сам вінаваты.

***

З горкі каля самага дома на санках каталіся дзеці. Вясёлыя, задаволеныя тварыкі. Адна пампушачка ў чорнай шубцы паспрабавала праехаць на ножках. Не ўтрымалася, павалілася. Выкачалася ў снег. Падняўся, крыху абтрэслася, заўсміхалася і зноў пабегла на горку.

***

Вялікі руды сабака выбег на некранутую, засыпаную снегам спартыўную пляцоўку, што была ля дома. Паваліўся на спіну і давай качацца.

— Быць завірусе, — падумаў я, успомніўшы старую людскую прыкмету. І сапраўды, праз некаторы час падзьмуў вецер, паваліў густы снег. Вакол было бачна адну белізну і нічога болей.

І. БАЛУШКА,
рэдактар райгазеты «Голас Касцюкоўшчыны».

ПА ЛЬВІНАМУ ЗАГАДУ

(байка)

Калісьці Леў
Ад самаўладства ашалеў
І так пачаў жывёл вучыць:
— Няхай з вас кожны зарычыць!
Навошта вам выццё, бляянне і мычанне?
Адно павінна быць гучанне.
А хто па-свойму голас падаваць заўзяты,
Таго адпраўлю ў Курапаты.

***

Загад усе прынялі за аснову.
Вось так і мы гублялі мову.

Сямён ПАЦЕМКІН.



АДЛІГА. Фотаэцюд Валерыя БЫСАВА.

Феліксс ШКІРМАНКОЎ


ВОР В ЗАКОНЕ...

Не так давно в одном лесу
Схватили за руку лису:
Без всякой очереди ловко
Берлогу заняла плутовка!
Сперва добром ее просили,
Но все впустую — пригрозили:
«Сама не выйдешь из берлоги,
Насильно вытащим за ноги!»,
На что, хвостом вильнув игриво,
Лиса сказала шаловливо:
— Вы что, ведь я — в законе вор,
Со мною в дружбе прокурор!
И было так, как рыжая сказала.
Она цену Законам знала.

Возможно кто-то возразит:
«Такого быть не может у зверей!»,
Согласен с ним... а у людей?

СКАЗКА О БЕЛОМ ТЕРЕМЕ

В стольном граде над рекой,
Там, где берег был крутой,
Среди кленов и берёз
Белый терем в землю врос.
По утрам служилый люд
В терем тот толпой идут.
Кто трудиться, кто дремать,
Все — зарплату получать.
Так и жили — мирно, тихо
И не чуяли, что лихо
В белоснежном терему
Строить начало нору.
В той норе и затаилось,
Но однажды все открылось.
Стекла в клетку, утром рано,
Подкатили два рыдвана.
Из рыдвана вышли трое,
Во втором остались двое.
Трое в терем зашагали,
Двое молча к двери встали.
А по терему смятенье:
«Быть не может — это вздор,
Чтобы Он был плут и вор!».
Добры молодцы могучие
Взяли вора
Под руки загребучие.
И перед всем честным народом
Потащили вора прямым ходом
К морю студёному,
Во дремучие леса.
Да случились вдруг
Чудеса...
Не попал вор
В леса дремучие.
Подхватили его силы
Нечистые, но могучие.
И не на холодное взморье,
А опустили его...
На соседнее подворье.
Тут и сказке конец.
А ты смекай, молодец,
Сказка — вымысел,
А всё ж,
Про нее не скажешь
— «Ложь!».



АНЕКДОТЫ

***

Преподаватель биологии привел студентов в биокабинет, подвел к скелету человека и спросил:
— Кто это?
— Скелет, — не задумываясь ответил один.
— Нет, — сказал преподаватель.
Другой студент назвал скелет по латыни.
— Нет, — сказал преподаватель.

Один из группы подошел к скелету и сказал:
— Это колхозник.
— Правильно, — сказал преподаватель, но объясните это название.
— Колхозник сдал шерсть, сдал яйца, сдал мясо, сдал кожу, вот что от него осталось.

***

Абрам и Иван сидели в одном окопе. Началась сильная артподготовка. Через несколько минут Абрам спрашивает:
— Какая бывает кровь?
Иван усмехнулся и ответил:
— Известно, что желтая.
— Тогда меня ранило, — испуганно произнес Абрам держась за задницу.

***

После усиленной артподготовки командир роты скомандовал:
— Орлы мои, вперед!!!
Все бросились за командиром и с криком «ура» заняли высоту Безымянная. Командир стал проверять личный состав и обнаружил, что двоих нет. Он приказал посыльному вернуться назад на исходный рубеж, узнать в чем дело. Посыльной вернулся и обнаружив двоих спокойно сидящих в своем окопе.
— А вы почему остались? — спросил он.
— Позвольте, команда ж была орлам, а мы львы, он Лев Исакович, а я Лев Борисович.

***

Абрам подал на Ивана в суд за оскорбление. Судья вызвал их и спросил Абрама:
— Как он вас оскорбил?
— Он назвал меня кирзовым сапогом.
— А какого размера? — спросил судья.
— Это он не сказал.
Судья провозгласил решение: «За недостаточностью улик дело прекратить».

С.ХРОМЕНКОВ.
Хотимский р-н
д. Чернявка.

За гал.рэдактара В.БОНДАРАЎ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Для пісьмаў: 213670, Хоцімскі раён, п/а Трасціно, в.Маркаўка, д.35. Тэлефоны: галоўнага рэдактара — 22-9-89, намесніка гал. рэдактара — 2-20-09, карэспандэнцкага пункта ў Касцюковічах 21-6-94, ў Клімавічах: 2-11-60; у Мсціслаўлі 5-09-27, у Крычаве 2-13-64. у Слаўгарадзе 2-16-96; у Горках 22-3-53.

Газета падпісана да друку ў 18 гадзін.

Заснавальнік працоўны калектыў рэдакцыі.

«Белорусский Восток». На белорусском и русском языках. Независимая общественно-политическая, литературно-художественная и религиозно-моральная газета. Выходит по субботам.

Пункт гледжання аўтараў друкуемых матэрыялаў можа не супадаць з пазіцыяй рэдакцыі.

Аўтары друкуемых матэрыялаў нясуць адказнасць за дакладнасць і даставернасць прыводзімых фактаў, цытат, статыстычных і іншых даных, асабістых імён і прозвішчаў, геаграфічных і іншых назваў і ўсякай прыводзімай інфармацыі, у тым ліку за наяўнасць у друкуемых матэрыялах даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі.

Рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца аўтарам.

Індэкс 64098 Газета набрана и отпечатана в Могилевской областной типографии ул.Первомайская, 70. Тираж 999 Цана 5 руб. Аб'ём 1 друк. аркуш. Зак. 4